Банцараўшчыны існавалі наземныя і паўзямлянкавыя жытлы. Большасць Н. ж. пл. 10—15 м² мелі чатырохвугольную форму, слупавую і зрубную канструкцыю. Агнішчы ў выглядзе каменнай вымасткі, абмазанай глінай, таўшчынёй 0,1—0,12 м, круглай (дыяметрам 1,7 м) або авальнай (даўж. 2,4 м, шырынёй 2,1 м) формы размяшчаліся пасярэдзіне жытла, часам трапляліся печы-каменкі. Перакрыцці двухсхільныя. Для эпохі Ст. Русі характэрны Н. ж. з бярвён, аднакамерныя з двухсхільнай страхой. Унутры, у адным з кутоў, на драўляных насцілах («апечках») размяшчаліся глінабітныя печы без комінаў. У Н. ж. сельскіх паселішчаў былі печы-каменкі. На аснове старажытнага Н. ж. развіліся разнастайныя тыпы і формы беларускага нар. жылля (гл. ў арт. *Жыллё, Народнае дойлідства, Хата*).

*Літ.:* Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 1—2.— Мн., 1970—72; Мельниковская О. Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке.— М., 1967; Митрофанов А. Г. Железный век Средней Белоруссии (VII—VI вв. до н. э.— VIII в. н. э.).— Мн., 1978; Исаенко В. Ф. Неолит Припятского Полесья.— Мн., 1976; Чарняўскі М. М. Неаліт Беларускага Панямоння.— Мн., 1979. *А. Р. Мітрафанаў.*

**НАЗІМАВА** Ірына Васілеўна (н. 22.2.1932, г. Тбілісі), беларускі сав. мастацтвазнавец, педагог. Скончыла Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна ў Ленінградзе (1957). У 1957—59 і ў 1978—83 ст. навук. супрацоўнік Дзярж. маст. музея БССР, адначасова выкладчык Мінскага ін-та культуры (1975—82), 1962—70 ст. выкладчык Бел. тэатр.-маст. ін-та, у 1973—78 ст. метадыст Палаца мастацтваў Саюза мастакоў БССР. Аўтар артыкулаў па праблемах бел. сав. выяўл. мастацтва і эстэтычнага выхавання ў перыяд. бел. і ўсесаюзным друку.

*Тв.:* А. А. Борисов.— Архангельск, 1959; Живопись.— Мн., 1962; М. А. Савіцкі. Мастак і кніга.— Мн., 1973; Зоя Литвинова. Моя Родина: Живопись.— М., 1983.

**НА́ЗІНА** Іна Дзмітрыеўна (н. 31.10.1937, Мінск), беларускі сав. музыказнавец-фальклярыст. Канд. мастацтвазнаўства (1979). Скончыла Бел. кансерваторыю па класу фп. (1961). Выкладала фп. ў Магілёўскім (1961—63) і Мінскім (1963—68) муз. вучылішчах. З 1970 малодшы, з 1981 старшы навук. супрацоўнік Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Асн. кірункі навук. дзейнасці: бел. фп. музыка (творчасць і выканальніцтва), нар. інструментальная культура (інструментарый, выканальніцтва, інстр. музыка). Аўтар шэрагу артыкулаў пра бел. нар. інструменты для «New groves dictionary of music and musicians» («Новы слоўнік музыкі і музыкантаў Грова», т. 2, 1984). Прапагандуе аўтэнтычны інстр. фальклор у этнагр. канцэртах, тэле- і радыёперадачах; падрыхтавала інстр. частку грампласцінкі «Музычны фальклор Беларускага Палесся», выд. ЮНЕСКА у серыі «Музычны фальклор народаў свету» (1982).

*Тв.:* Белорусский фортепианный концерт.— Мн., 1977; Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые.— Мн., 1979; Белорусские народные музыкальные инструменты: Струнные.— Мн., 1982. *А. А. Саламаха.*

**НАЗО́ЎНІК**, знамянальная часціна мовы, якая характарызуецца граматычным значэннем прадметнасці. Н. абазначаюць канкрэтныя прадметы, жывых істот, абстрактныя паняцці, рэчывы, апрадмечаныя дзеянні, якасці, уласцівасці, працэсы, з'явы і інш.

Паводле значэння падзяляюцца на агульныя («горад», «паэт») і ўласныя («Васіль», «Свіцязь»), адушаўлёныя («чалавек», «арол») і неадушаўлёныя («вецер», «ноч»), асабовыя («мужчына», «патрыёт») і неасабовыя («неба», «алень»), канкрэтныя («стол», «год») і абстрактныя («воля», «слава»), зборныя («моладзь», «крылле»), рэчыўныя («лён», «хлеб»). Н. маюць самастойныя катэгорыі *роду*, ліку, склону. Паводле склонавых форм Н. падзяляюцца на 3 тыпы *скланення*. Могуць уступаць у сэнсава-сінтаксічныя сувязі з інш. словамі ў сказе і ўтвараць адпаведныя тыпы *словазлучэнняў*. У сказе найчасцей выконваюць ролю *дзейніка, дапаўнення*, радзей — *выказніка, акалічнасці, азначэння*.

Н. з'яўляюцца важным выяўл. сродкам маст. л-ры і публіцыстыкі. У тэксце яны могуць набываць пераноснае значэнне і выкарыстоўвацца ў якасці метафары («Ачуньвай жа, **зорка**, ачуньвай, мой **квеце**, пачуй маё шчырае слова». Я. Колас), метаніміі («**Палец з брыльянтам** адшукаў на сталe гузік званка». Э. Самуйлёнак), сінекдахі («Прыціскаючыся, выйшлі на вуліцу. **Камень, камень** і **камень** усюды». П. Галавач), увасаблення («**Бор**, аб чым ты гудзіш, **шлях**, куды ж ты вядзеш?». А. Куляшоў), алегорыі («Ехаў **Дзедка** на кірмаш, з ім на возе **Баба**». К. Крапіва), параўнання («**Волатам** устае твой народ, калі наступае пагроза». Т. Хадкевіч), эпітэта («То не снег — то чаромха цвіце: падарунак вясны-**дабрадзейкі**». З. Бядуля) і інш.

*Літ.:* Наркевіч А. І. Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы.— Мн., 1976; Беларуская граматыка. Ч. 1.— Мн., 1985. *А. І. Наркевіч.*

**«НАІ́ЎНАЕ» МАСТА́ЦТВА**, творчасць у галіне выяўленчага мастацтва, якая характарызуецца наіўна-рэалістычным адлюстраваннем рэчаіснасці з выкарыстаннем вобразных сродкаў, адметных ад акадэмічных. «Н.» м. як сістэма маст.-вобразнага мыслення ў самадз. выяўл. мастацтве стварыла характэрныя і адносна ўстойлівыя кампазіцыйныя схемы. Рысы яго стылістыкі блізкія да традыцыйнага нар. эстэт. светаўспрымання. Маст. вобраз складаны, часцей незвычайны, вылучаецца цэласнасцю прадметнага бачання, прастадушным абаяннем, шчырасцю, непасрэднасцю, колеравай дэкаратыўнасцю (у жывапісе), своеасаблівай дзіцячасцю ў інтэрпрэтацыі натуры. Сусветна вядомая творчасць такіх майстроў «Н.» м. канца 19— пач. 20 ст., як А. Русо, Н. Пірасманашвілі, І. Генераліч. Прадстаўнікамі наіўнага жывапісу і скульптуры ў самадз. выяўл. мастацтве Беларусі з'яўляюцца М. Засінец, М. Чарвякоў, П. Гольцаў, А. Кіш, Г. Ганчаронак, В. Альшэўскі, М. Ерафееў і інш. *Р. Ф. Шаура.*

**НАЙГРЫШ**, народная інструментальная мелодыя, часам і мелодыя з суправаджэннем (напр., Н. гармоніка). Звычайна тэрмін «Н.» выкарыстоўваюць у дачыненні да танц. мелодый.